# Інфармацыйна-аналітычная сістэма

# «Геастатыстыка»

## Кіраўніцтва карыстальніка

https://gis.belstat.gov.by/

Інфармацыйна-аналітычная сістэма «Геастатыстыка» (далей – Сістэма) прызначана для:

- устанаўлення ўзаемасувязі афіцыйнай статыстычнай інфармацыі (далей – АСІ) з адпаведнымі геаграфічнымі аб'ектамі (аб'ектамі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага і тэрытарыяльнага дзялення Рэспублікі Беларусь);
- аналізу АСІ ў картаграфічным прадстаўленні, уключаючы выніковыя даныя перапісу насельніцтва;
- забеспячэння карыстальнікам доступу да прасторавых даных і АСІ.

Работа карыстальніка ў сістэме праходзіць у інтэрактыўным рэжыме.

Сапраўднае Кіраўніцтва прызначана для карыстальнікаў партала, якія прагледжваюць, экспартуюць статыстычныя даныя.

Каб навучыцца працаваць у Сістэме, неабходна крок за крокам правесці ўсе дзеянні, якія апісаны ў Кіраўніцтве. Варта звяртаць увагу на нумарацыю паведамленняў там, дзе яна прысутнічае. Для большай нагляднасці паведамленні і ўказальныя стрэлкі аформлены ў чырвоным колеры.

1. Галоўная старонка

Для пераходу на галоўную старонку Сістэмы неабходна ўвесці адрас Сістэмы https://gis.belstat.gov.by/ у радок пошуку браўзера, націснуць Enter.

Карыстальніку адлюстроўваецца галоўная старонка:




Аб партале

## ГЕАСТАТЫСТЫКА

Каб перайсці да прагляду АСІ неабходна націснуць адпаведную кнопку:




Аб партале

# ГЕАСТАТЫСТЫКА

## 2. Галоўная старонка прагляду даных

Пры пераходзе да даных карыстальніку адлюстроўваецца галоўная старонка прагляду даных:



## 2.1. Укладка «Слаі»

Ва ўкладцы «Слаі» карыстальніку даступна прыбліжэнне карты да пэўнага аб'екта АТА і ТА. Для прыбліжэння неабходна выбраць аб'ект са спісу:



Калі аб'ект выбраны, карта адцэнтруецца да яго:



Для ўключэння адлюстравання слоя з АСІ на карце неабходна выбраць яго з дрэвавіднага спісу слаёў:



### 2.2. Укладка «Табліцы»

Ва ўкладцы «Табліцы» карыстальніку даступны выбар, адлюстраванне і экспарт АСІ ў выглядзе табліцы. Для прагляду даных неабходна выбраць год, набор даных, а таксама адну ці некалькі АТА. Пры выбары адной АТА, табліца будзе сфарміравана на аснове ўсіх слаёў набору даных для выбранай АТА.

Пры выбары некалькіх АТА выбар слоя (паказчыка) з'яўляецца абавязковым. У табліцы адлюстроўваюцца даныя па выбраным слоі па адпаведных АТА:




Год
2022
Набор дадзеных
Удзельная вага насельніцтва, якое мае м...
Вобласці
Брэсцкая вобласць +4
Раёны, гарады абласнога падпарадкавання, раён...
Сельсаветы і населеныя пункты
Выбар пласта
жанчыны
ПАБУДАВАЦЬ
Удзельная вага насельніцтва, якое мае мабільны тэлефон (у працэнтах) (жанчыны)
Брэсцкая вобл. 97.1 %
Віцебская вобл. 98.3 %
Гомельская вобл. 97.1 %
Гродзенская вобл. 98.2 %
Магілёўская вобл. 98.6 %
1. Выбраны год
2. Выбраны набор даных
3. Выбрана некалькі АТА
4. Пры выбары некалькіх АТА выбар паказчыка з'яўляецца абавязковым. Пабудова ажыццяўляецца па выбраным слоі набора даных

Сфарміраваную табліцу можна экспартаваць у фарматах: PDF, PNG, XLSX. Для гэтага неабходна скарыстацца кнопкай экспарту і выбраць тып файла:




Пры націску на кнопку, якая адпавядае фармату файла, ажыццяўляецца экспарт даных у выбраны фармат. Файл захоўваецца на лакальным камп'ютэры карыстальніка.

### 2.3. Укладка «Кругавая дыяграма»

Ва ўкладцы «Кругавая дыяграма» карыстальніку даступны выбар, адлюстроўванне і экспарт АСІ ў выглядзе дыяграмы. Для прагляду даных неабходна выбраць год, набор даных, а таксама АТА.

Выбар некалькіх АТА недаступны. Выбар слоя (паказчыка) з'яўляецца абавязковым. Пры выбары адной АТА дыяграма будзе сфарміравана па ўсіх ніжэйлеглых АТА. Пры выбары «Усе» на ўзроўні абласцей дыяграма будзе сфарміравана па ўсіх абласцях і г. Мінску:



Год
2022
Набор дадзеных
Колькасць мікра, малых і сярэдніх арганіз...
Вобласці
Брэсцкая вобласць
Раёны, гарады абласнога падпарадкавання, раённыя цэнтры
Усе
Сельсаветы і населеныя пункты
Выбар пласта
2022 г.
ПАБУДАВАЦЬ
Колькасць мікра, малых і сярэдніх арганізацый (адзінак) (2022 г.)
Брэсцкая вобласць, Іванаўскі р-н 165 адз.
Брэсцкая вобласць, Івацэвіцкі р-н 297 адз.
Брэсцкая вобласць, Баранавіцкі р-н 411 адз.
Брэсцкая вобласць, Брэсцкі р-н 572 адз.
Брэсцкая вобласць, Бярозаўскі р-н 300 адз.
1. Выбраны год
2. Выбраны набор даных
3. Выбрана адна АТА. Дыяграма будзе пабудавана па усіх ніжэйлеглых АТА
4. Выбар слоя абавязковы. Пабудова ажыццяўляецца па выбраным слоі набора даных
Siedlce
Łuków
Węgrów
Sokołów Podlaski
Radzyń Podlaski
20 km

Пры навядзенні мышы на паказчык адлюстроўваецца інфармацыя па ім:




Для экспарту дыяграмы неабходна націснуць на кнопку экспарту даных, выбраць тып файла:




Пры націску на кнопку, якая адпавядае фармату файла, ажыццяўляецца экспарт даных у выбраны фармат. Файл захоўваецца на лакальным камп'ютэры карыстальніка.

## 2.4. Укладка «Гістаграма»

Ва ўкладцы «Гістаграма» карыстальніку даступны выбар, адлюстроўванне і экспарт ACI ў выглядзе гістаграмы. Для прагляду даных неабходна выбраць год, набор даных, а таксама адну ці некалькі АТА. Пры выбары адной АТА, гістаграма будзе сфарміравана на аснове ўсіх слаёў набору даных для абранай АТА.

Пры выбары некалькіх АТА выбар слоя (паказчыка) з'яўляецца абавязковым. У гістаргграме адлюструюцца даныя па выбраным слоі па адпаведных АТА:


Год
2022
Набор дадзеных
Ураджайнасць сельскагаспадарчых культ...
Вобласці
Брэсцкая вобласць
Раёны, гарады абласнога падпарадкавання, раён...
Сельсаветы і населеныя пункты
Выбар пласта
ПАБУДАВАЦЬ
Ураджайнасць сельскагаспадарчых культур у сельскагаспадарчых арганізацыях (Брэсцкая вобласць)
бульба, 2...
259 цэнтнераў з гектара
збожжавыя...
38.1 цэнтнераў з гектара
0
75
150
225
300
1. Выбраны год
2. Выбраны набор даных
3. Выбрана адна АТА
4. Пры выбары адной АТА недаступны выбар паказчыка. Пабудова ажыццяўляецца па ўсіх слаях набору даных
Калининградская область
Ostrołęka
Płock


Год
2022
Набор дадзеных
Ураджайнасць сельскагаспадарчых культ...
Вобласці
Брэсцкая вобласць
+4
Раёны, гарады абласнога падпарадкавання, раён...
Сельсаветы і населеныя пункты
Выбар пласта
бульба, 2022 г.
ПАБУДАВАЦЬ
Ураджайнасць сельскагаспадарчых культур у сельскагаспадарчых арганізацыях (бульба, 2022 г.)
Брэсцкая ...
259 цэнтнераў з гекта
Віцебская...
313 цэнтнераў з гекта
Гомельска...
203 цэнтнераў з гектара
1. Выбраны год
2. Выбраны набор даных
3. Выбраны некалькі АТА
4. Пры выбары некалькіх АТА выбар паказчыка з'яўляецца абавязковым. Пабудова ажыццяўляецца па выбраным слоі набора даных
Telšių apskritis
województwo podlaskie
Łomża
Ostrołęka
Białystok

Пры навядзенні мышы на паказчык адлюстроўваецца інфармацыя па ім:



Для экспарту гістаграмы неабходна націснуць на кнопку экспарту даных, выбраць тып файла:




Пры націску на кнопку, якая адпавядае фармату файла, ажыццяўляецца экспарт даных у абраны фармат. Файл захоўваецца на лакальным камп'ютэры карыстальніка.

## 2.5. Укладка «Пошук»

На ўкладцы «Пошук» даступныя:

- пошук па слаях;
- пошук па суб'ектах гаспадарання.

Для выбару тыпу пошуку неабходна выбраць тып са спісу:



Для пошуку слоя з АСІ можна выбраць АТА, у гэтым выпадку карта наблізіцца да абранай АТА. Таксама неабходна ўключыць адлюстраванне паказчыка (слоя) на карце з дапамогай выбару паказчыка са спісу:



### 2.5.1. Пошук па суб'ектах гаспадарання

Пры пошуку па суб'ектах гаспадарання даступна фільтрацыя па арганізацыйна-прававой форме, віду эканамічнай дзейнасці, АТА. На карце адлюструюцца толькі суб'екты гаспадарання, якія адпавядаюць уведзенаму пошукаваму запыту:



Пы націску на іконку, якая адлюстроўвае знойдзены на карце суб'ект гаспадарання, з’яўляецца інфармацыя па гэтым суб'екце гаспадарання:



## 2.6. Вобласць карты

На карце размяшчаюцца групы кнопак, з дапамогай якіх можна ажыццяўляць аперацыі з картай:




Пры націску на кнопкі «Наблізіць», «Аддаліць» ажыццяўляецца адпаведна набліжэнне, аддаленне карты.

Пры націску на кнопку «Выбар падложкі» адлюстроўваецца акно з трыма варыянтамі падложкі для карты:

- OpenStreetMap;
- OpenTopoMap;
- Без падложкі.



Інструмент «Лінейка» дазваляе вымяраць даўжыню лініі (у тым ліку ломанай) на карце:



Для экспарту бачнай часткі карты неабходна націснуць на кнопку экспарту даных, выбраць тып файла:




Бачная частка карты захаваецца на лакальным камп'ютэры карыстальніка ў адпаведным фармаце.

Пры націску на кнопку «Разгарнуць на ўвесь экран» карта разгорнецца на ўвесь экран. Аналагічна ажыццяўляецца згортванне карты ў зыходнае становішча.

Пры націску на кнопку «Экстэнт па змаўчанні» карта маштабуецца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь:



Пры ўключаным слоі адлюстроўваецца кнопка «Легенда», з дапамогай якой ажыццяўляецца ўключэнне/выключэнне легенды:




Легенда таксама экспартуецца разам з картай, у выпадку яе ўключэння.

Дзякуй за выкарыстанне нашай сістэмы!